74.58
И.29

# ИДЕОЛОГИЧЕСКАЯ РАБОТА И МЕРЫ ПО ЕЕ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ

Тезисы докладов межвузовской
преподавательско-студенческой
научной конференции

УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ БАНКОВСКИЙ КОЛЛЕДЖ
НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ИДЕОЛОГИЧЕСКАЯ РАБОТА И МЕРЫ ПО ЕЁ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ

Тезисы докладов
межвузовской преподавательско-студенческой
научной конференции

Пинск, 25 мая 2006 г.

Пинск 2006

УДК 37+32+36(06)
ББК 74.58 + 66.0
Т 29 Тезисы докладов межвузовской преподавательско-студенческой научной конференции
И 29 Идеологическая работа и меры по её совершенствованию

Материалы печатаются в основном в том виде, в котором они были представлены авторами. Только в некоторых случаях они сокращены или подредактированы - там, где это было особенно необходимо.

Материалы печатаются по решению кафедры социально-гуманитарных дисциплин. Протокол. № 9 от 21.04.2006г.

*Ответственный за выпуск* **М.В. Цуба**

**Идеологическая** работа и меры по её совершенствованию: Тез: докл. межвуз. препод.-студен. научн. конф. Пинск, 25 мая 2006 г. 144 с.

СОДЕРЖАНИЕ

*Татаревич Валентина Федоровна* Идеологическое сопровождение воспитательной работы 5

*Макарушко Владимир Владимирович* Идеологическая работа и меры по ее совершенствованию 13

*Боричевская Валентина Васильевна* Информационная безопасность в сфере идеологической работы 17

*Игнатюк Елена Александровна* Эстетическая потребность: красота «формы» 20

*Можейко Павел Павлович* Христианство в современном мире 29

*Григорик Виктория Александровна* Конфессиональное состояние в г. Пинске (православие, католицизм) 37

*Гордич Анна Александровна* Конфессиональное состояние в г. Пинске (иудаизм, протестантизм) 42

*Ясинский С.А.* Спорт и идеология 46

*Фядзечка Сяргей Аляксеевіч* Фарміраванне ідэалогіі адносін да нацыянальных меншасцяў у II Рэчы Паспалітай 51

*Мисюковец Любовь Петровна* Социокультурная среда ВУЗа и её влияние на формирование личности студента 58

*Левченко А.Н.* Экономика и идеология 64

*Цуба Міхаіл Віктаравіч* Пачатак Першай сусветнай вайны і фарміраванне ідэалагічнай думкі на прыфрантавой паласе 69

*Гичун Д.И.* Партизанское движение в Беларуси. 86

*Шчэрба Галіна Аляксандраўна* Расійскі фактар і станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў 20-я гады XX ст. 91

*Гагуа Руслан Борисович* Грюнвальдская битва в воспитании патриотизма при преподавании истории 99

*Грицкевич Татьяна Евгеньевна Шайковская Ольга Николаевна* Роль истории Отечества в формировании гражданской позиции современной молодежи 102

*Ковшик Татьяна Константиновна* Идеология как фактор развития белорусского общества на современном этапе 106

*Никитина Елена Васильевна* Идеология как основа формирования мировоззрения и гражданской позиции личности 111

*Евстафьев В.А.* Об эффективности идеологического влияния на молодежь 117

*Дмитриев Денис Андреевич* Идеология и проблемы молодежи 122

*Жилинский Павел Аркадьевич* Направление идейно-воспитательной работы в учебном заведении 126

*Петрушкевич Ольга Евгеньевна* Идеологическая работа в учреждениях образования 132

*Казакевіч Аляксандр Анатольевіч* Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў пачатку XIX ст. 135

# РАСІЙСКІ ФАКТАР І СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў 20-Я ГАДЫ XX СТ.

*Г.А. Шчэрба*

*(ПДВБК)*

Станаўленне беларускай дзяржаўнасці звязана з утварэннем Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Але гэты працэс праходзіў больш складана і драматычна. Падмурак нашай сувярэннасці - мацнейшы. Утварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове - гэта спрошчаны падыход і не ўлічвае палітыку ўрада РСФСР у Заходнім рэгіёне Расійскай імперыі. На працягу лета-восенні 1918 г. улада РСФСР не ішла далей пазіцыі абласніцтва ў вырашэнні нацыянальнага пытання. Камісія УЦВК РСФСР прапанавала на тэрыторыі былой царскай Расіі ліквідаваць усялякі нацыянальнальны падзел і стварыць акрамя Маскоўскай яшчэ тры вобласці, ці камуны. І тады Заходняя вобласць меркавалася ў складзе Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Чарнігаўскай, Віленскай і Ковенскай губерняў з абласным цэнтрам у Мінску. Такой пазіцыі прытрымліваліся таксама кіраўнікі Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) і Аблвыканкамзаха на чале з А. Мясніковым, М. Калмановічам і іншымі, што знаходзіліся ў Смаленску. Адмаўлялася ў той час нават пачатковая форма нацыянальнай дзяржаўнасці Беларусі - абласная аўтаномія, прапанаваная Белнацкамам, які быў створаны ў адпаведнасці з дэкрэтам У. Леніна ад 31 студзеня 1918 г. і функцыянітраваў на правах аддзела Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР.

Пазіцыю Белнацкама падтрымлівала Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б), арганізаванных з бежанцаў-беларусаў. На май 1918 г. у Расіі жыло звыш 2 млн. бежанцаў з Беларусі. Рашэнні канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б) 21-23 снежня 1918 г. фактычна паставілі ЦК РКП(б) перад

неабходнасцю вырашыць праблему нашай дзяржаўнасці. 24 снежня гэтае пытанне было разгледжана ЦК РКП(б) - хутчэй за ўсё шляхам размоў І. Сталіна па тэлефоне з А. Мясніковым, як тады нярэдка практыкавалася.

25 снежня на сустрэчах І. Сталіна са З. Жылуновічам, І. Дылам і іншымі адказнымі супрацоўнікамі Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б), а 27 снежня з М. Мясніковым і М. Калмановічам былі вызначаны паўнамоцтвы і склад будучага ўрада, акрэслена тэрыторыя рэспублікі ў складзе 5-ці губерняў (Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай). VI Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б) па дакладу А. Мяснікова прыняла рашэнне 30 снежня 1918 г. аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі. Таму дата нараджэння рэспублікі - 30 снежня, а не 1 студзеня, калі было абнародаванне Маніфеста.

Аднак і пасля гэтага пытанне аб беларускай дзяржаўнасці не было знята з парадку дня ні ў Маскве, ні на ўзроўні мясцовых партыйных арганізацый. Яно набывала ўсё больш драматычны характар.

І. Сталін асабіста ўладжваў узніклыя канфлікты паміж А. Мясніковым і З. Жылуновічам па складу Часовага ўрада Беларусі. У адсутнасць Сталіна (ён спешна выязджае на Усходні фронт у сувязі з крытычнай сітуацыяй) адбыліся падзеі, якія карэнным чынам паўплывалі на дзяржаўнасць Беларусі. 16 студзеня 1919 г. пленум ЦК РКП(б) прыняў адмоўнае для беларускай дзяржаўнасці рашэнне: забраць у толькі што створанай Беларускай рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні, уключыць іх у склад РСФСР, пакінуўшы ў складзе Беларусі Мінскую і Гродзенскую. Старшыня УЦВК і сакратар ЦК РКП(б) Я. Свярдлоў уласнаручна дапісаў пункт 7 пастановы, які прадпісваў вынесці на з'езд Саветаў Беларусі рашэнне аб аб'яднанні Мінскай і Гродзенскай губерняў з Літвой.

Такое штучнае дзяленне, было прадыктавана прычынамі знешнепалітычнага характару - наступленнем войск Польшчы, па-першае, а па-другое, - абароназдольнасць рэспублік нават у аб'яднанні з Літоўскай была б больш эфектыўнай у складзе ўсіх пяці губерняў, а не ва ўрэзаным

выглядзе. Таму ідэя стварэння выратавальнага буфера, выказаная ў апошніх публікацыях, прысвечаных дзяржаўнасці Беларусі, застаецца толькі гіпотэзай. Адказ на гэтае пытанне можна знайсці ў дакументах Асобай нарады, малявядомых да апошняга часу.

Жыццё Асобай нарадзе дала пастанова УЦВК РСФСР ад 23 снежня 1918 г. пры Народным камісарыяце дзяржкантролю РФ у сувязі з утварэннем Латвійскай, Эстонскай і Літоўскай савецкіх рэспублік і прызнаннем іх незалежнасці. Абвяшчэнне беларускай дзяржаўнасці выклікала адмоўную рэакцыю ўдзельнікаў нарады, як аб'ектыўнай абумоўленасці, так і фінансава-эканамічных узаемаадносін. Акцэнтавалася ўвага на цяжкасцях тэрытарыяльнага характару, што прынясе Беларуская рэспубліка дзяржаўным утварэннем, асабліва Літве. Так на чацвёртым пасяджэнні Асобай нарады 4 студзеня 1919 г. адзначалася, што "для вызначэння тэрыторыі Беларусі і ўстанаўлення яе межаў з сумежнымі дзяржавамі, цяжка знайсці іншую прыкмету, акрамя беларускага дыялекту". Таму калі кіравацца гэтай прыкметай, то Беларусі адыйдзе большая частка так званых літоўскіх губерняў, а для Літвы застанецца невялікая тэрыторыя "з нязначнай колькасцю насельніцтва".

На пасяджэнні Асобай нарады 14 студзеня 1918 г., за 2 дні да пленума ЦК РКП(б), не гледзячы на факт самавызначэння беларускага народа, ўдзельнікі нарады канстатавалі: "для ўтварэння незалежнасці ад Расіі Беларусі высноў не маецца". 18 студзеня на нарадзе быў зроблены вывад, што "адсутнічаюць умовы не толькі самастойнай Беларускай рэспублікі, але нават штата, як часткі федэратыўнага арганізма з моцна развітай эканомікай".

Матэрыялы гэтай нарады з'явіліся падмуркам для прыняцця прыведзенага вышэй рашэнняў пленума ЦК РКП(б), якія былі прадыктаваны прычынамі ўнутрыпалітычнага і эканамічнага характару ва ўмовах грамадзянскай вайны, пераходу да палітыкі харчразвёрсткі, калі асноўнай праблемай для савецкай краіны была харчовая. Выпадзенне з гаспадарчага

разліку трох губерняў - Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай, стварала дадатковыя цяжкасці для функцыяніравання традыцыйных гаспадарчых сувязяў гэтых губерняў з Цэнтрам.

Да таго ж прававыя формы міждзяржаўных адносін яшчэ не былі распрацаваны і разумелася ізаляванасць эканамічных сувязяў з Расіяй. Для большасці мясцовых работнікаў, якія арыентываліся на беларускую дзяржаўнасць у яе этнаграфічных межах з цэнтрам ў Мінску, новая стратэгія Масквы была не зусім зразумелай. Кіраўніцтву Заходніх губерняў тэрмінова была выслана тэлеграма за подпісам Я. Свярдлова. У ёй прадпісвалася выдзяленне з Беларускай рэспублікі Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай губерняў, пакідаючы ў складзе Беларусі дзве губерні - Мінскую і Гродзенскую. Для ажыццяўлення прынятых рашэнняў у Беларусь камандзіраваўся ў якасці спецыяльна ўпаўнаважанага ЦК РКП(б) А. Іофэ, які планаваўся на пасаду старшыні ЦВК ЛітБела.

Супраць штучнага дзялення этнічнай Беларусі рашуча выступіла савецка-партыйнае кіраўніцтва рэспублікі, як з ліку аднадумцаў З. Жулуновіча, так і прыхільнікаў А. Мяснікова. Яны лічылі, што яе падзел немэтазгодны і недапушчальны. Нягледзячы на абгрунтаваныя выступленні членаў Цэнтральнага бюро КП(б)Б - С. Іванова, І Лагуна, А. Мяснікова, Р. Найдзёнкава, М. Пятрова, І. Рэйнгольда, якія справядліва папракалі партыйнае і савецкае кіраўніцтва РСФСР у цэнтралісцка-біракратычным падыходзе да вырашэння пытання аб Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губернях і шкоднасці яго для будучага нацыянальна-эканамічнага развіцця Беларусі, А. Іофэ настаяў на фактычным прыняцці рашэння ЦК РКП(б). У знак пратэсту супраць валюнтарысцкіх метадаў вырашэння нацыянальнага пытання ў Беларусі ў канцы студзеня 1919 г. урад БССР пакінулі тры наркамы - Ф. Шантыр, У. Фальскі, Я. Дыла.

Таму Іофэ ў пісьме Свярдлову ад 28 студзеня адзначыў, што абедзве группы нікуды не вартыя. Беларусы, ці група Жылуновіча, - нацыяналісты, а

Мяснікоў з яго прыхільнікамі - сепаратысты яшчэ горшай маркі, і раіў разагнаць іх, паслаць на працу куды-небудь далей ад Беларусі.

Аднак ідэя дзяржаўнасці Беларусі знаходзіла ўсё большую колькасць сваіх прыхільнікаў і сярод савецка-партыйнага актыву былой Паўночна-Заходняй вобласці. Гэтыя настроі яскрава выявіліся ў канцы студзеня 1919 г. на Мінскай губернскай партыйнай канферэнцыі. На ёй выказаўся недавер прадстаўніку ЦК РКП(б) Іофэ і патрабаванні адклікаць яго з Беларусі. Сур-ёзныя заўвагі былі выказаны і ў адрас Свярдлова.

Канфлікт ліквідаваў І. Сталін. На І Усебеларускім з'ездзе Саветаў 23 лютага 1919 г., у якім прымаў удзел Свярдлоў, было прадубліравана рашэнне аб аб'яднанні рэспублік Літвы і Беларусі. З утварэннем гэтай штучнай дзяржаўнасці як бы здымалася з парадку дня пытанне аб далучэнні этнічных беларускіх зямель да РСФСР. У склад новага ўрада ЛітБела З. Жылуновіч і А. Мяснікоў не увайшлі. Трагічна склаўся лёс іншых дзеячаў. Яны былі арыштаваны і расстраляны. Такі сумны вынік першапачатковага этапу стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Ён наклаў свой адмоўны адбітак на пазіцыю кіраўнікоў Мінскгубрэўкама ў ліпені 1920 г., калі ў другі раз вырашалася пытанне аб абвяшчэнні ССРБ і яе тэрыторыі.

Пасля вызвалення 11 ліпеня 1920 г. Мінска, а затым большай часткі тэрыторыі Беларусі ад польскіх войскаў скпаліся аб'ектыўныя передумовы для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Аднак праблема для кіраўніцтва Савецкай Расіі і на гэты раз была падпарадкавана ваенна-палітычнай мэце. Пра гэта сведчыць падпісаны ў Маскве 12 ліпеня 1920 г. мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР. Згодна з дагаворам частка этнічнай беларускай тэрыторыі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, а таксама Віленскі край з Вільняй былі прызнаны часткай Літвы. Дагавор гарантаваў нейтралітэт Літвы ў ходзе савецка-польскай вайны, бяспеку правага фланга войскаў Заходняга фронту ў яго наступленні на Варшаву. Літоўска-Беларуская ССР юрыдычна перастала існаваць.

Патрэбна была лінія на аб'яднанне палітычных сіл, якія б адстойвалі тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі ва ўмовах, калі пачаліся перагаворы ў Рызе паміж расійскай і польскай дэлегацыямі. Але гэтага аб'яднання не было. Нявыпадкова беларуская нацыя, яе этнічная тэрыторыя пасля заключэння 18 сакавіка Рыжскага дагавора аказалася раздзелянай на доўгі час на тры часткі. Як суверэнная дзяржава Беларуская рэспубліка існавала пасля другога абвяшчэння ў межах толькі 6 паветаў былой Мінскай губерні. Яе плошча складала 52,4 тыс. км$^2$, а насельніцтва 1 544 000 чалавек.

Узнікае пытанне, ці разумелі кіраўнікі Савецкай Беларусі ўсю складанасць сітуацыі, у якой апынулася новаўтвораная беларуская дзяржаўнасць і чаму не паставілі перад кіраўніцтвам Расіі пытанне пра неабходнасць далучэння усходніх этнічных зямель Беларусі. Абмеркаванне пытанняў адбылося на пасяджэнні ЦК КП(б)Б ад 11 лістапада 1920 г. "Аб тэрыторыі Беларусі". А. Чарвякоў канстатаваў у сваім выступленні, што "сярод насельніцтва заўважаюцца, праўда няясна, тэндэнцыі да незалежнасці. Беларускае насельніцтва не церпіць палякаў, але асаблівай любові не адчувае і да камуністаў".

Удзельнікі пасяджэння прыйшлі да паразумення лічыць пытанне аб пашырэнні Беларусі несвоечасовым. Праз тыдзень пасля абмеркавання пытання на пасяджэнні ЦК КП(б)Б, 17 лістапада, у ЦК РКП(б) адбылася нарада па беларускаму пытанню. На ёй прысутнічалі ад Беларусі А. Чарвякоў, В. Кнорын і Рафес.Першым было разгледжана "пытанне аб тэрыторыі Савецкай Беларусі" і прызнана пазіцыя наркама замежных спраў Р. Чычэрына аб "непажаданным далучэнні да тэрыторыі Беларусі якіх-небудзь частак Віцебскай ці Магілёўскай губерняў. Мы яшчэ не ведаем праз якія перапетыі можа прайсці лёс Беларусі". Такая пазіцыя супярэчыла аб'ектыўнаму працэсу развіцця беларускай нацыі.

Аднак рэальнае жыццё паказала, што штучны разрыў адзінага этнасацыянальнага арганізма беларускай нацыі з'яўляецца вялікай перашкодай паспяховаму нацыянальна-дзяржаўнаму і культурнаму

будаўніцтву Беларусі. 1 лютага 1921 г. паступіла дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б за подпісамі 32-х камуністаў-беларусаў. У ёй падкрэслівалася аб неабходнасці далучэння да БССР Віцебскай, Гомельскай і тых паветаў былой Магілёўскай губерні, якія былі ўключаны ў склад Смаленскай губерні і "складаюць адзіны гаспадарчы арганізм". Складальнікі запіскі лічылі, што ва ўмовах, калі дагавор паміж Расіяй і Польшчай яшчэ не падпісаны, вяртанне ўсходніх этнічных беларускіх зямель яшчэ больш павялічыць аўтарытэт новай улады.

Нягледзячы на адмоўныя вывады для складальнікаў "заявы 32-х", гэтым быў пакладзены пачатак практычнаму вырашэнню праблем усходніх этнічных беларускіх зямель. Уваходжанне БССР у склад СССР, удасканаленне саюзных адносін паміж рэспублікамі паскорыла вырашэнне тэрытарыяльнага пытання.Толькі ў сакавіку 1924 г., дзякуючы актыўным палітычным намаганням тагачаснага старшыні ЦВК Беларусі А. Чарвякова, старшыні Саўнаркама Яз. Адамовіча, наркама асветы У. Ігнатоўскага і іншых беларускіх дзяржаўных дзеячаў, да БССР былі далучаны 8 паветаў Віцебскай і 7 паветаў Гомельскай, Горацкі і частка Мсціслаўскага павета Смаленскай губерняў.

Аднак спатрэбілася больш як два гады, каб далучыць Гомельскі і Рэчыцкі паветы ў снежні 1926 г. на карысць Беларусі.

Не абышлося і без тэрытарыяльных страт: Веліжскі, Невельскі і Себежскі паветы Віцебскай губерні, у якіх беларусы мелі пераважную большасць, былі ўключаны ў Пскоўскую губерню. Тым не менш тэрыторыя Беларусі склала 125590 км$^2$ з насельніцтвам каля 5 млн. чалавек. Фактычна палова беларускага этнасу апынулася ў Савецкай Беларусі.

Вяртанне БССР тэрыторый на ўсходзе ўяўляла сабою важны этап у складаным працэсе аб'яднання беларускай нацыі, значна ўзмацніла эканамічны патэнцыял Савецкай Беларусі, павысіла яе вагу ў грамадска-палітычным жыцці тагачаснага СССР, павялічыла міжнародны аўтарытэт рэспублікі. Цэнтральную ролю ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці на

савецкай аснове адыграў расійскі фактар, імкненне кіраўніцтва Савецкай Расіі стварыць на заходніх рубяжах своеасаблівы бар'ер з нацыянальных савецкіх рэспублік, а таксама актыўныя дзяржаваўтваральныя дзеянні палітычных і нацыянальна-дзяржаўных дзеячаў Беларусі: З. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага, А. Чарвякова і інш.

Сёння, калі пра Бсларусь, яе курс ведае ўвесь свет, будзем помніць пра складаныя перыпетыі нашай дзяржаўнасці ў XX ст., каб падмурак нашай суверэннасці быў мацнейшы.

Літаратура:

1. Скалабан В. У. Бежанцы...// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя. 1993. С. 339.

2. Гл.: Гісторыя Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. Люты 1917—1997 гг.: Вуч. дап. Пад рэд. Я. К. Новікава, Г.С. Марцуля. Мн.: Універсітэцкае, 1998. С. 63.

3. Пратакол I з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Менск, 1934. С. 32.

4. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ), ф. 3, воп. 1, спр. 4671, арк. 1.

5. Міхнюк У., Малыхіна Л. Гісторыя Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі ў падручніках і вучэбных дапаможніках Рэспублікі Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 7. С. 9.

6. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ), ф. 4390, воп. 2, спр. 61, арк. 27 - 28.

7. Тамсама, арк. 21.

8. Тамсама, арк. 8.

9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 60, воп. 3, спр. 443, арк. 62.

10. Тамсама, ф. 4, воп. 1, спр. 1, арк. 20 - 21.

11. Найдзёнкаў Р. П. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. 1999. С. 273.

12. Бюлетэнь загранічнай групы Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. 1926. № 5 (красавік - травень). С. 14 - 15.

13. НАРБ, ф. 242, воп. 2, спр. 6, арк. 50.

14. Тамсама, ф. 60, воп. 3, спр. 443, арк. 50.

15. Тамсама, ф. 242, воп. 2, спр. 6, арк. 51.

16. Тамсама, ф. 4863, воп. 3, спр. 478, арк. 74.

17. Тамсама, арк. 75.

18. Тамсама, ф. 325, воп. 1, спр. 21, арк. 248.

19. Ладысёў У. Расійскі фактар і беларуская дзяржаўнасць у 20-я гады XX ст.// Беларуская думка 2006, № 2